

ЦІ З'ЯВІЦЦА НОВЫ МЕМАРЫЯЛ АХВЯРАМ ВАЙНЫ 8-9

ЛЮДЗІ З ДРЭВА І ЦЕПЛЫНІ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 106 (29986)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму:**

*«Падрыхтоўка Беларусі да II Гульняў краін СНД ужо выйшла на фінішную прамую. Падрыхтоўка ідзе праз тэставыя спаборніцтвы. Мы вызначаем у першую чаргу работу ўсіх тэхнічных службаў, гатоўнасць менавіта спартыўнай інфраструктуры. Паралельна правяраем, глядзім месцы пражывання, месцы харчавання спартсменаў, суддзяў, адміністрацыі ўсяго персаналу, у якіх умовах будуць нашы госці, нашы спартсмены тут пражываць. На працягу двух тыдняў праедзем усю Беларусь і паглядзім кожны аб'ект, каб унесці неабходныя карэктывы, недзе навесці парадак».*

# КАВАЛЬСКАЯ АРЦЕЛЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Традыцыйныя кавалі, якія працягваюць вогненна-жалезную справу і дасягнулі ў ёй найвышэйшага ўзроўню, Сяргей КУДЗІКАЎ з Мсціслава і Дзяніс АШЧЭПКАЎ з Баранавіцкага раёна былі запрошаны на фестываль-кірмаш народных мастацкіх рамёстваў «Вясновы букет», які прайшоў у першую суботу лета ў сталіцы. Яны паказалі гасцям свае кавальскія сувеніры і разам папрацавалі каля горна і накавальні.

## КОРАТКА

- **Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ў 102 раёнах Беларусі.**
- У Беларусі за студзень—красавік уведзены ў эксплуатацыю больш за 1 млн кв. м жылля.



- **Першы ўкос траў праведзены на амаль 48 працэнтах плошчаў.**
- З пачатку года беларускім бязвізам скарысталася звыш 187 тысяч замежнікаў.
- **Больш за 31 тысячу чалавек падало заяўкі на работу ў студатрадах.**
- ВТБ (Беларусь) зніжае стаўку па крэдыце на тавары айчынных вытворцаў.

Свая справа

# З ГЛЫТКОМ «ПАВЕТРА»

### Мінчанка набыла старую закінутую хату на Палессі, знайшла сваё шчасце і перамяніла ўсё жыццё

**З першага погляду дом Іны РОДАК абудзіў даўнюю асацыяцыю: менавіта такой некалі ўявіла сабе аграсядзібу, калі толькі пачула гэтае слова. Да слова «сядзіба» не надта пасуюць цяперашнія гмахі-катэджы з усімі суперсучаснымі выгодамі, з банкетнымі заламі на падворку, дзе з лёгкасцю можа размясціцца сотня чалавек, з асобнымі кухнямі і іншымі падсобнымі пабудовамі. Сядзіба — гэта пра старую хату з бабулінымі ручнікамі і саматканымі ходнікамі, з чыгунамі на прыпечку і дымам з коміна.**

СТАР. 11



Па палічках

# БАЧАЦЬ ВОЧЫ, ШТО КУПЛЯЮЦЬ?

### Як спажыўцу абараніць свае правы, набываючы тавары на сайтах



**Продаж тавараў праз інтэрнэт у Беларусі актыўна развіваецца. Сёння ў краіне зарэгістравана амаль 29 тысяч інтэрнэт-крам, палова з якіх належыць індывідуальным прадпрымальнікам, палова — юрыдычным асобам. За апошні год іх колькасць узрасла на 3,7 % (з'явілася больш за тысячу новых). Спектр тавараў, якія прадаюцца праз інтэрнэт, хутка пашыраецца, і з часам, на думку спецыялістаў, магчыма, будзе з'яўляцца больш спецыялізаваных крамаў, з аднаго боку. З другога — намячаецца тэндэнцыя да стварэння маркетплэйсаў (агрэгатараў) — пляцовак, дзе існуе шмат інтэрнэт-крам ці мноства інтэрнэт-гандляроў. Пра тое, як развіваецца інтэрнэт-гандаль у Беларусі, з якімі праблемамі сутыкаюцца пакупнікі, на што звяртаць увагу, набываючы тавар праз сеціва, і іншыя акалічнасці расказала спецыяліст Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ).**

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

23106

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!